*МІНСКІ АБЛАСНЫ ЦЭНТР НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ*

*падрыхтавала вядучы метадыст па фальклоры Алена Ляшкевіч*

# *М І Н Ш Ч Ы Н А*

# *К А Л Я Д Н Ы*
# *К А Л Я Н Д А Р*
# *2012-2013*

Каляндарныя святы, звычаі і абрады Міншчыны – адна з істотных частак духоўнай культуры, энцыклапедыя народных ведаў пра прыроду, свет і самога чалавека. Для Цэнтральнага рэгіёна Беларусі характэрна шырокае распаўсюджанне і добрая захаванасць каляднага абрадавага комплексу, у якім вылучаюцца тры кульмінацыйныя кропкі: пярэдадзень Каляд (Першая куцця), пярэдадзень Новага года (Шчодры вечар), Вадохрышча. Да ўсіх трох галоўных свят гатавалася куцця, у гэты перыяд адбывалася гаспадарчая і любоўная варажба, выконваліся абрады прадукавальнай магіі.

Агульнасямейная перадкалядная вячэра (Першая куцця) – пераломны адрэзак часу, калі адбывлася ўсталяванне кантакта жывых з прадстаўнікамі “таго свету” (дзяды, прыродныя стыхіі) з мэтай падтрымання агульнага і асабістага дабрабыту.

Паўсюль на Міншчыне да Шчодрага вечара прымеркаваны дзявочыя варожбы, мелі месца рытуальныя свавольствы моладзі. Зафіксавана пяць тыпаў калядных абыходаў, асаблівай яркасцю і багаццем сярод якіх вылучаюцца абходы з удзелам маскіраванай казы. На сённяшні дзень калядныя абрады з’яўляюцца жывой актуальнай праявай святочнага народнага календара многіх населеных пунктаў Міншчыны, як, напрыклад, абрад “Калядныя цары”, што праводзіцца у в. Семежава Капыльскага раёна, абрад “Шчадрэц” у в. Рог Салігорскага раёна і інш.

Вадохрышча на Міншчыне мае паўсюднае бытаванне. Тэрыторыя распаўсюджвання абрадаў адпісвання / провадаў Каляд ахоплівае цэнтр Беларусі. Лакальную спецыфіку паўднёва-заходніх раёнаў Міншчыны складае звычай святкавання пасля Вадохрышча “Паабед-Каляды”. Мікралакальнай традыцыяй, уласцівай толькі Бярэзінскаму раёну, з’яўляецца рытуал “провадаў” пад назвай “Цягнуць Каляду на дуба”.

| № п/п | Месца правядзення | Дата | Кароткае апісанне | Адказныя, кантактныя тэлефоны |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Вяляціцкі СДК, Барысаўскі р-н | 13.01.2013 | Хатняе правядзенне<br>Героі: народны абрад “Прыехала Каляда” Звяздар, Шчодра, Павадыр з Казой, Цыган з Канём, Механоша, Музыкі | Барысаўскі<br>РЦНТ<br>8 0177 72 07 79<br>Няхайчык Алена Алегаўна мтс 8029 860 61 60 |
| 2. | в. Новаянчына Барысаўскі раён | 13.01.2013 | Нова–Янчынскі Дом фальклору, свята “Каляды”<br>Хатняе правядзенне<br>Героі: Вядучы, Гаспадар, Калядоўшчыкі, Каза | Барысаўскі<br>РЦНТ<br>8 0177 72 07 79<br>Няхайчык Алена Алегаўна мтс 8029 860 61 60 |
| 3. | В. Новіны<br>Бярэзінскі раён | 6.01.2013<br>13.01.2013<br><br><br>19.01.2013<br>21.01.2013 | Бедная куцця<br>Праграма “Калядныя шчадроўкі”. Удзельнічаюць 2 дзіцячыя гурты і 1 дарослы<br>Вадохрышча<br>Абрад провадаў Каляд “Каляду на дуба” знаходзіцца ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей РБ з 2011 году. У в. Новіны гэта жывая традыцыя.<br>21 студзеня раніцай збіраюцца і ўпрыгожваюць куль саломы ад зажыначнага снапка (або дажыначнага — гэтае пытанне патрабуе навуковага вывучэння), які заўсёды захоўваўся і прыносіўся ў хату перад першай каляднай куццёй і стаяў у чырвоным куце ўсё свята. З гэтага куля рабілі абрадавую ляльку, якую апраналі ў жаночае адзенне: спадніцу, кофту, фартух, хустку. Звараную ў чыгунку або гліняным гаршку куццю ставілі на сена ў рэшата, бралі старое кола ад воза або барану і везлі на санях або на саначках да дуба, які адзінока стаяў у полі або ў канцы сяла. Старое кола і саламяную ляльку, калі яны захаваліся з мінулага года, скідалі з дуба і падпальвалі, а на дуб усцягвалі новую ляльку ў жаночай іпастасі, кола | Пытляк Валянціна Анатольеўна<br>8 01770 3 18 19 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | або барану і куццю. Спявалі абрадавыя песні, вадзілі карагод вакол дуба, а потым пілі гарэлку, закусвалі пад дубам і ішлі да месца збору, дзе святкавалі заканчэнне каляднага цыкла святаў. Танцавалі, спявалі, гулялі. Гэтак жа абрад спраўляюць і зараз. | |
| 4. | А.г. Любушаны<br>Бярэзінскі раён | 6.01.2013<br>13.01.2013<br>19.01.2013<br><br>21.01.2013 | Бедная куцця<br>Калядаванне (дарослы гурт)<br>Вадохрышча<br>Абрад провадаў Каляд "Каляду на дуба" знаходзіцца ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей РБ з<br>2011 году. У в. Любушаны гэта адноўленая традыцыя. | Пытляк Валянціна Анатольеўна<br>8 01770 3 18 19 |
| 5. | В. Чыжаха<br>Бярэзінскі раён | 13.01.2013<br>21.01.2013 | Калядаванне<br>Абрад провадаў Каляд "Каляду на дуба" знаходзіцца ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей РБ з 2011 году. У в. Чыжаха гэта адноўленая традыцыя. | Пытляк Валянціна Анатольеўна<br>8 01770 3 18 19 |
| 6. | Вёскі Каменны Барок, Дзмітравічы, Аграгарадкі Пагост, Касаўка, Сяліба, Мікулічы, Уша, Паплавы | 13.01.2013 | Калядаванне | Пытляк Валянціна Анатольеўна<br>8 01770 3 18 19 |
| 7. | п. Ракаў, Валожынскі раён | 26.12.2012<br>30.12.2012<br><br><br>13.01.2013 | Калядаванне па каталіцкіх хатах<br>Калядная вечарына для дарослых (з удзелам заслужанага аматарскага<br>калектыву "Гасцінец")<br>Калядная вечарына для ўдзельнікаў гурткоў і іх бацькоў (з удзелам<br>і ўзорнага фальклорнага калектыву "Вянок") | тэл. 8 01772 52-2 29 пр., Velkom 3679123 – Лямбовіч Хрысціна Станіславаўна |
| 8. | в. Сакаўшчына,<br>Валожынскі раён | 25 .12.2012<br>07.01. 2013 | Калядныя праграмы з удзелам калектыву мастацкай самадзейнасці Сакаўшчынскага СДК на мясцовым матэрыяле. Персанажы: цыганка, цыган, каза, дзед… | тэл. 8 01772 39-172, Velkom 9727709<br>Шадрына Антаніна Вячаславаўна |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9. | В. Чаркасы, Дзяржынскі раён | 05. 01. 2012 | Чаркаскі СДК (праграма ў клубе) - “На Каляды ўсе людзі рады!” Галоўнай адметнасцю тут было перапрананне. Пераапраналіся так, што немагчыма было пазнаць адзін аднаго.. прыходзілі хлопцы і прыводзілі “ігорнага сабаку” (пераапрануты жыхар вёскі) і ўсе дзяўчаты ў насцярожанасці чакалі каго ён схопіць. Час ідзе, вёску Чаркасы насялілі жыхары з усіх куткоў Беларусі, кожны з іх прынёс сваю вясковую культуру. | Дырэктар – Шык Кірыл Іванавіч 8(01716)212-05<br>Яніна Канстанцінаўна Ярмаловіч<br>Мтс 8029 702 85 54 |
| 10 | в. Скірмантава, Дзяржынскі раён | 7.01.2013 | “Каляда, Каляда”.Удзень удзельнікі мастацкай самадзейнасці збіраюцца ў сельскім Доме культуры. Пераапранаюцца ў касцюмы калядоўшчыкаў: мядзведзя, бусла, звяздара, цыганоў, каня, казу і механошу. Бяруць з сабою музыкантаў, шумавыя інструменты і накіроўваюцца па вёсцы. Калядны абрад рэканструяваны на аснове мясцовых традыцый. | Дырэктар – Рэдзько Наталля Пятроўна – 8(01716)306-75 |
| 11 | в. Баравікі Дзяржынскі р-н | 07.01.2013 | “Каляды ў Баравіках” – сцэнічнае дзеянне. | Дырэктар – Рагоза Марыя Антонаўна – 8(01716) 471-21 |
| 12 | в. Семежава<br>Капыльскі р-н | 13.01.2013 | У кастрычніку 2009 года калядны абрад “ Цары” в. Семежава Капыльскага раёна занесены ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. У спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей РБ абрад знаходзіцца з 2007 году.<br>У гурт калядных “цароў” уваходзяць сем маладых хлопцаў. Гэта былі так званыя “чыстыя маскі”. Хлопцы, якія выконвалі ролі цароў, імкнуліся апрануцца як мага прыгажэй, з форсам.<br>Акрамя іх, у складзе гурта абавязкова былі “нячыстыя маскі”: дзед і баба. | Галіна Аляксандраўна Гурло<br>8029 853 48 51 |
| 13 | в. Худаўцы Крупскі раён | 13.01.2013 | Вячоркі “Ай, калядачкі, бліны-ладачкі!” сцэнічная праграма, абыход вёскі. Праграма зроблена на мясцовым матэрыяле. | Стаднік Галіна .Станіслаўна<br>8 01796 4-42-26<br>Крупскі РЦК Наталля Фёдараўна<br>8 01796 54 946 |
| 14 | В. Ухвала, Крупскі раён | 13. 01.2013 | Абрад калядавання “Прыйшла каляда – адчыняй вароты!” Ухвальскі ЦкіА<br>Абыход вёскі на аснове мясцовых традыцый, з | Карпач Святлана Алегаўна<br>8 01796 4-74-95<br>Мтс 8 033 33 606 12 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | тэатралізаванымі ўстаўкамі | |
| 15 | Калачаўскі СДК<br>Лагойскі раён | 07.01.2013<br><br><br><br><br>14.01.2013 | Тэатралізаванае прадстаўленне-віншаванне з абходамі двароў “Калядам усе рады” на аснове мясцовых традыцый, з тэатралізаванымі ўстаўкамі<br>Калачаўскі СДК<br>Абрад “Шчордрык” | Лагойскі РАМЦ 8 01774 5 38 43<br>Бярозка Валянціна Яўгенаўна |
| 16 | Швабскі СДК<br>Лагойскі раён | 7.01.2013 | Абрад-віншаванне “Ішла каляда калядуючы” з удзелам вакальнага калектыву аматарскай творчасці (калядныя песні, танцы, элементы тэартралізацыі) | Лагойскі РАМЦ 8 01774 5 38 43 Бярозка Валянціна Яўгенаўна |
| 17 | Г. Любань | 12.01.2012 | З’езд калядных гуртоў Любанскага раёна. Гурты паказваюць праграмы, з якімі яны калядуюць у сваіх родных вёсках | Выскварка Сяргей Георгіевіч, Любанскі РЦК<br>5- 50- 74<br>Маб. 329-87-57 |
| 18 | в. Закальное<br>Любанскі раён | 13.01.12 | Закальнецкі СДК<br>“Шчодрык” У в. Закальное абрад пройдзе з удзелам калядных мясцовых персанажаў, Каза, Жораў, Механоша, Цыганкі і дзед-пачынальнік. Каза тут спецыяльная з абруча ад дзяжы. А песні гучаць у выкананні аўтэнтычнага фальклорнага гурта “Глыбокія крыніцы” які за сваю спеўную манеру выкананне абрадавых і пазаабрадавых песень мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці РБ. | Выскварка Сяргей Георгіевіч, Любанскі РЦК<br>5- 50- 74<br>Маб. 329-87-57 |
| 19 | в. Забалаць Любанскі раён | 13.01.12 | Забалацкі СДК. Калядуе  узорны фальклорны ансамбль “Нашчадкі” дзяўчаткі зберагаюць традыцыю шчадравання па дварах і карагод “Ой, жарка, жарка каліна ў лузе” які спявалі дзяўчаіам на выданні. | Выскварка Сяргей Георгіевіч, РЦК<br>5- 50- 74<br>Маб. 329-87-57 |
| 20 | В. Дарасіно Любанскі раён | 21.01.12 | Дарасінскі СДК  Вечарынка“На пабед Каляды” Традыцыйная калядная вечарынка, пасля якой лічыцца каляды скончыліся, да абеду святкуюць, а пасля абеду працуюць. Вечарынка з народнымі танцамі і гульнямі, і канечне ж песнямі аўтэнтычнага гурта “Кацярынка” | Выскварка Сяргей Георгіевіч, РЦК<br>5- 50- 74<br>Маб. 329-87-57 |
| 21 | в. Обчын Любанскі раён | 13.01.12 | Обчынскі СДК  Абрад“Шчодрык” дзе поруч з | Выскварка Сяргей Георгіевіч, РЦК |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | бабулямі спяваюць і вандруюць маладыя вяскоўцы, такой казы й такой цыганкі не сустрэнеш больш ні дзе. Затое на вёсцы можна сустрэць яшчэ безліч калядных гуртоў | 5- 50- 74<br>Маб. 329-87-57 |
| 22 | в. Ямінск Любанскі раён | 13.01.12 | Ямінскі СДК Абрад “Шчодрык” Пераапранутыя шчадроўцы калядуюць ад хаты да хаты з зоркаю, чортам, гармонікам. …спяваюць калядныя песні “Добры вечар, шчодры вечар”, “Шчодрык”, “Го-го-го, каза”, скачуць з казою, якая затым “памірае”. Гаспадынька частуе ўсякімі смачкамі, каб козачка ўстала. Валачобнікі з песнямі выходзяць з хаты. Шчадруе моладзь разам з аўтэнтычным фальклорным гуртом “Журавушка” | Выскварка Сяргей Георгіевіч, РЦК<br>5- 50- 74<br>Маб. 329-87-57 |
| 23 | В. Раеўшчына Маладзечанскі р-н | 07.01.2013 | Калядаванне па вёсцы на аснове мясцовых традыцый | Данілевіч Ванда Феліксаўна<br>8029 506 23 85 |
| 24 | Беразінскі СДК Маладзечанскі раён | 07.01.2013 | Сцэнічная праграма, потым калядаванне па вёсцы на аснове мясцовых традыцый | Хвядковіч Валянціна Тадэвушаўна<br>8029 909 77 66 |
| 25 | Маркаўскі СДК Маладзечанскі раён | 14.01.2013 | Калядаванне па вёсцы на аснове мясцовых традыцый | Варанецкая Алена Мікалаеўна<br>8029 654 12 06 |
| 26 | в. Восава Салігорскі раён | 13.01.2013 | Абрад “Шчадрэц” у в. Рог адбываўся з удзелам традыцыйных маскіраваных персанажаў, як зааморфных – казы, жураўля, каня, так і антрапаморфных – дзеда, бабы, “цыгана” і “цыганкі” з “дзіцём” (лялькай) у “калысцы”. Найбольш унікальны персанаж у гурце шчадравальнікаў у в. Рог – гэта дзед і яго берасцяная маска, аналагаў якой больш няма на Беларусі. | Салігорскі РАМЦ<br>Данілевіч Антаніна Рыгораўна<br>8 0174 22-05-37<br>Храловіч Марына Уладзіміраўна<br>8 0174 22 05 63 |
| 27 | п. Усяж Смалявіцкі раён | 06.01.2013 | Усяжскі сельскі Дом культуры У п.Усяж адбудзецца калядная вандроўка “Прыехала Калядзіца”, часткова на мясцовым матэрыяле. | дырэктар Сташкевіч Наталля Іванаўна<br>т. МТС 5675918 |
| 28 | В. Усяжа, Смалявіцкі р-н | 07.01.2013 | Праграма “Ходзім грамадою, усіх віншуем з калядою”, часткова на мясцовым матэрыяле | Лушчык Аксана Міхайлаўна<br>Маб. Лайф 8025 935 14 50 |
| 29 | аграгарадок Барсукі Смалявіцкі р-н | 07.01.2013 | аграгарадок Барсукі запрашае на тэатралізаванае калядаванне “Калядная зорка”, часткова на мясцовым матэрыяле | Барсукоўскі СДК дырэктар – Колісава Вікторыя Анатольеўна т. вел. 3393622, |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 30 | вёска Жажэлка<br>Смалявіцкі раён | 07.01.2013 | Калядны гурт Жажэлкаўскага сельскага клуба адправіцца ў святочнае калядаванне “З хаты ў хату нясем свята”, часткова на мясцовым матэрыяле (калядныя персанажы, у т.л. Жораў) | Жажэлкаўскі СК загадчыца Казлоўская Ніна Чаславаўна<br>т.вел. 6898624 |
| 31 | Г. Старыя Дарогі | 13.01.2013 | Стылізацыя на аснове мясцовага матэрыялу. 18.00 Калядаваньне па хатах (па папярэдніх запрашэннях) 20.00 сцэнічная праграма на галоўнай плошчы. | Старадарожскі РЦКіА<br>Бірук Любоў Уладзіміраўна<br>Пр. 8 01792 5-47-60 |
| 32 | В. Слабада<br>Стаўбцоўскі р-н | 7.01 | Дзіцячае калядаванне, часткова на мясцовым матэрыяле | |
| 33 | В. Хатляны Уздзенскі р-н | 20.01.2012 | Хатлянскі СДК<br>Вячоркі “Пабеда Каляды” на мясцовым матэрыяле | Уздзенскі РЦК<br>8 017 18 5-42 – 70<br>Наталля Васільеўна Марук |
| 34 | Кухціцкі СДК Уздзенскі р-н | 14.01.2012 | Кухціцкі СДК Вячоркі “На Каляды ўсіх вас бачыць рады” | Уздзенскі РЦК<br>8 017 18 5-42 – 70<br>Наталля Васільеўна Марук |
| 35 | в.Горкі Чэрвеньскі р-н | 07.01.2013 | Асаблівасцю калядавання ў в.Горкі з’яўляецца тое, што абрад строіцца на мясцовых асаблівасцях святкавання з выкарыстаннем аўтэнтычных песнь і побытавых танцаў, якія выконваюць удзельнікі дзіцячага фальклорнага калектыву “Весялінка” разам з мясцовымі бабулямі.<br>Абрад “Ехала Каляда на чырвоным вазочку” распачне гадавое кола народных свят, якія праводзяцца ў Горкаўскім Сельскім Доме Фальклору. | Чэрвеньскі РЦКіА<br>Разумоўская Святлана Васільеўна<br>8 017 18 5-43-84 |
| 36 | в. Турэц Чэрвеньскі раён | 07.01.2013 | У аснове сцэнарыя пакладзены не мясцовы фальклорны матэрыял, а стылізаваны, узяты з адпаведных крыніц. | Чэрвеньскі РЦКіА<br>Разумоўская Святлана Васільеўна<br>Пр. 5-43-84 |
| 37 | В. Раванічы Чэрвеньскі раён | 13.01.2013<br>14.01.2013 | Раваніцкі СДК. Калядаванне па вёсцы, тэатралізаваны матэрыял. У склад гурта калядоўнікаў ўваходзяць традыцыйныя персанажы: механоша, дзед-павадыр, каза, зорканоша, мядзведзь. | Чэрвеньскі РЦКіА<br>Разумоўская Святлана Васільеўна<br>8 01714 5-43-84 |